***Антановіч Н. М.***, *дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антонава Н. У.***, *начальнік аддзела метадычнага забеспячэння пачатковай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# Беларуская мова. II клас

## Установы адукацыі з беларускай мовай навучання

*Працяг. Пачатак гл. № 9,10 за 2022 г.*

### Урок* 35. Гукі [д] і [дз']. Іх абазначэнне на пісьме

***Мэта ўрока:*** адпрацоўваць правільнае вымаўленне гукаў [д], [дз'] і слоў з імі; фарміраваць уменне адрозніваць гукі [д], [дз'] і абазначаць гэтыя гукі літарамі на пісьме; адпрацоўваць уменне дзяліць для пераносу словы з ***дз***; фарміраваць уменне працаваць з арфаграфічным слоўнікам, абгрунтоўваць напісанне літар ***д***, ***дз*** у словах з апорай на схему; развіваць фанематычны слых, вымаўленчыя навыкі; пазнаёміць са слоўнікавым словам *мядзведзь*; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць паважлівыя адносіны да бацькоў.

***Абсталяванне:*** малюнкі рыбы, футбаліста, агурка, дзяцей, чабару; літары разразной азбукі і наборнае палатно; сігнальныя карткі.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

— Пра які гук гаварылі на мінулым уроку? Дайце яму характарыстыку з апорай на форзац. *(Гук* [дз'] *— зычны, мяккі, звонкі.)* Як ён абазначаецца на пісьме? *(Гук* [дз'] *абазначаецца на пісьме літарамі* ***д*** *і* ***з***.*)*

Маўленчае практыкаванне «Збяры словы з гукам [дз']»: настаўнік вымаўляе словы, вучні па дамоўленасці на словах з гэтым гукам выконваюць нейкі рух (тупнуць нагой, пляснуць у далоні, падняць руку ці іншыя жэсты). У канцы практыкавання вучні называюць словы з гукам [дз'] (хто больш запомніў) і хорам вымаўляюць іх. Гавораць, у якім складзе слова пачулі гэты гук. Словы для выкарыстання: дзяжурны, дарога, дрэва, дзік, вада, дзяцел, дровы, іду, паўзе, калодзеж, золкі, Надзея, надвор'е, Дзяніс, студзень, дзірка, доўгі, каза.

***Практыкаванне 166.***

Пасля асобных слоў такая ж праца ажыццяўляецца з вершам дамашняга практыкавання: настаўнік выразна чытае яго, вучні сігналізуюць на словах з гукам [дз'] і хорам вымаўляюць іх. Называюць, у якім складзе слова пачулі гэты гук.

— Якія літары галосных гукаў напісаны пасля ***дз***?

— Як назваць адным словам родны край, родную зямлю? *(Радзіма.)* Як пішацца гэтае слова? Чаму? Якія словы верша паказваюць, што аўтар любіць, шануе сваю Радзіму?

**3. Этап замацавання вывучанага.**

***Практыкаванне 167.***

Матэрыял практыкавання лепш трансфармаваць і падаць на дошцы ў наступным выглядзе:

[малюнак рыбы] у [ ]**дз**е (ва**д**а).
[малюнак футбаліста] у [ ]**дз**е (каман**д**а).
[малюнак агурка] на [ ]**дз**е (гра**д**а).
[малюнак дзяцей] на [ ]**дз**е (прыро**д**а).

— З дапамогай слоў у дужках складзіце сказы.

Вучні вымаўляюць сказы, якія атрымаліся.

— Вымавім і параўнаем словы ў дужках і словы, якія атрымаліся з іх у сказах. Які гук з'явіўся на месцы гука [д]?

Вучні з каменціраваннем запісваюць або сказы, або толькі словы з гукам [дз'], або пары слоў з гукамі [д] і [дз'] у залежнасці ад магчымасцей вучняў класа, іх адукацыйнага патэнцыялу. Словы з ***дз*** пры запісе падзяляюцца для пераносу. Перад выкананнем гэтага задання вучні ўзнаўляюць правіла пераносу слоў з дыграфам ***дз***.

***Работа з матэрыялам рубрыкі «Увага».***

Настаўнік прапануе параўнаць гукі [д] і [дз'] з дапамогай схемы:

| | | | |
|---|---|---|---|
| [д] | ? | ? | ? |
| | Зычны ці галосны? | Звонкі ці глухі? | Цвёрды ці мяккі? |
| [дз'] | ? | ? | ? |

— Чым адрозніваюцца гукі [д] і [дз']?

Па прапанове настаўніка вучні чытаюць матэрыял рубрыкі, адказваюць на пытанне і расказваюць, пра што яшчэ даведаліся.

***Практыкаванне 168.***

Работа са схемай арганізуецца настаўнікам спачатку франтальна і праводзіцца з мэтай адказаць

* Этап работы па фарміраванні навыкаў каліграфічнага пісьма (чыстапісанне) уключаецца ў структуру ўрока настаўнікам і праводзіцца ў сістэме. Матэрыял па чыстапісанні адбіраецца з улікам тыповых графічных памылак вучняў класа.

на пытанні, якія ўтрымліваюцца ў схеме. Паслядоўна вучні чытаюць і дапаўняюць схему патрэбнай інфармацыяй. Мэтазгодна з дапамогай літар разразной азбукі сфарміраваць поўную схему на дошцы. Па гэтай схеме настаўнік працуе са словам *гняздо* ў ролі вучня, які памыляецца ці не ведае, што рабіць далей. Вучні класа падказваюць яму ці выпраўляюць. З наступнымі словамі *..ённік*, *ха..іў* індывідуальна працуюць вучні каля дошкі. Астатнія сігналізуюць з дапамогай сігнальных картак, ці правільна яны адказваюць. Апошнія два словы *..аведнік*, *па..яка* вучні аналізуюць па схеме ў парах.

Пасля выканання гэтай работы па меркаванні настаўніка вучні могуць запісаць словы ў сшытак самастойна, зрабіць узаемаправерку.

***Практыкаванне 169.***

Перш, чым пазнаёміць вучняў з вершам, настаўнік прапануе разгарнуць старонку 97 падручніка і знайсці на ёй малюнкі чарніц і суніц. Пасля гэтага паказвае малюнак чабару і называе расліну. Настаўнік просіць вучняў назваць гэтыя расліны ласкава (чарнічка, сунічка, чабарок).

— Паслухайце верш і скажыце, за што дзякавалі тату.

Настаўнік выразна чытае верш. Вучні ўспрымаюць яго толькі на слых, адказваюць на пытанне.

***Работа са слоўнікавым словам.***

Настаўнік дае заданне прачытаць верш самастойна і назваць членаў сям'і. Вучні знаёмяцца з напісаннем слова *мядзведзь*, падзяляюць яго на склады. Вызначаюць галосныя і тлумачаць напісанне літар замест пропускаў. Аналагічна працуюць са словам *медзведзяняты*. Асаблівую ўвагу настаўнік звяртае на правапіс **я** ў першым складзе перад націскам.

Далейшая работа з вершам ажыццяўляецца па пытаннях і заданнях пасля тэксту ў вучэбным дапаможніку.

***Практыкаванне 170.***

Праца з тэкстам практыкавання распачынаецца з пытанняў настаўніка: «Што абазначае слова *лістапад*? Як вы думаеце, каго можна назваць лістападнікам?» Уважліва выслухоўваюцца ўсе версіі вучняў. Далей настаўнік прапануе разгледзець малюнак і сказаць, ці можна каго-небудзь на ім назваць лістападнікам і чаму. Каб праверыць здагадкі, настаўнік прапануе вучням прачытаць тэкст. Пасля гэтага вучні расказваюць, каго называюць лістападнікамі. Выказваюць сваё стаўленне да падзей.

Заданне па выпісванні слоў з прапушчанымі літарамі можа быць арганізавана з каменціраваннем, франтальна з выкананнем на дошцы ці самастойна з узаемаправеркай. Пры неабходнасці настаўнік звяртае ўвагу вучняў на схему разважанняў для вызначэння літары.

**4. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 117, практ. 171. На ўроку трэба, каб настаўнік прачытаў верш вучням, задаў пытанні на разуменне яго зместу. Разам з вучнямі трэба звярнуцца да тлумачальнага слоўніка ў падручніку і вызначыць, што абазначае слова *цыбаты*.

**5. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— У чым адрозненне гукаў [д] і [дз']? Як яны перадаюцца на пісьме? Якія літары «дапамагаюць» перадаць цвёрдасць [д] і мяккасць [дз']?

## Урок 36. Гукі [д] і [дз']. Іх абазначэнне на пісьме

***Мэта ўрока:*** адпрацоўваць правільнае вымаўленне гукаў [д], [дз'] і слоў з імі; фарміраваць уменне абазначаць гук [дз'] літарамі на пісьме; адпрацоўваць уменне абгрунтоўваць напісанне літар, вызначаць націск у словах; фарміраваць уменне ўстанаўліваць правільную паслядоўнасць пунктаў плана, пераказваць тэкст, уменне працаваць з арфаграфічным слоўнікам; выпрацоўваць уменне пісаць пад дыктоўку, ажыццяўляць узаемаправерку; развіваць фанематычны слых, вымаўленчыя навыкі; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць клапатлівыя адносіны да птушак.

***Абсталяванне:*** сігнальныя карткі.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

Вучні прыгадваюць, чым падобныя і чым адрозніваюцца гукі [д], [дз'].

***Практыкаванне 171.***

Вучні чытаюць верш па сказах, тлумачаць устаўленыя літары. Астатнія вучні класа рэагуюць з дапамогай сігнальных картак.

**3. Этап замацавання вывучанага.**

***Практыкаванне 172.***

Для ўзмацнення цікавасці вучняў да задання можна выкласці яго на дошцы ці на картках у жартоўнай рэдакцыі (як варыянт, можна прапанаваць малюнкі замест першых слоў у сказах):

Гарбузы ляжаць у ва..е.
Вішні растуць у гняз..е.
Рыбы плаваюць у са..е.
Птушаняты пішчаць на гра..е.

Вучні павінны вызначыць, што не так у гэтых сказах. Пасля сэнсавай перапрацоўкі сказаў, якая заключаецца ва ўстанаўленні патрэбных па сэнсе месцаў для апошніх слоў, пачынаецца арфаграфічная работа. Вучні вымаўляюць словы з пропускам літар, характарызуюць гук на месцы пропуску і называюць літары, якімі трэба яго абазначыць. Пасля гэтага выконваецца пісьмовае заданне з вучэбнага дапаможніка.

***Практыкаванне 173.***

Выкананне практыкавання заснавана на гукалітарным аналізе слоў, якімі можна назваць малюнкі вучэбнага дапаможніка. Паслядоўнасць работы з кожным словам наступная:

1. Назваць прадмет, які адлюстраваны на малюнку (месяц, дом, дыня, дзьмухавец, мядзведзь).
2. Вымавіць слова, выразна прагаварыць гукі.
3. Вызначыць месца гука [д]/[дз'] у слове, даць яму характарыстыку (звычны, цвёрды/мяккі).
4. Растлумачыць, якой літарай трэба абазначыць яго і наступны галосны гук.
5. Запісаць слова, калі ў ім ёсць гук [дз'], падкрэсліць літары, якімі ён абазначаны.
6. Зрабіць праверку (спосаб праверкі вызначае настаўнік у залежнасці ад падрыхтаванасці вучняў).

***Практыкаванне 174.***

Заданне мае на мэце практыкаваць вучняў у вызначэнні віду арфаграмы. Пасля чытання загадкі настаўнікам праводзіцца гутарка, у працэсе якой

вызначаецца адгадка. Слова *сланечнік* вучні павінны знайсці ў арфаграфічным слоўніку і праверыць яго правапіс.

Наступны этап работы прысвячаецца падрыхтоўцы і спісванню загадкі згодна з алгарытмам, пададзеным на форзацы ў канцы вучэбнага дапаможніка. Неабходна мець на ўвазе, што праца з ім павінна адбывацца пры дастаткова высокай ступені самастойнасці вучняў.

Пасля спісвання і праверкі тэксту выконваецца заданне па пастаноўцы націску ў словах і вызначэнню літары, якая гука не абазначае. Для паспяховага выканання гэтага задання неабходна паўтарыць веды пра націск, атрыманыя ў II класе. Мэтазгодна ў словах з мяккім знакам вусна вызначыць колькасць гукаў і літар.

***Практыкаванне 175.***

Выкананне заданняў практыкавання накіравана на падрыхтоўку вучняў да напісання пераказу, таму праца з тэкстам максімальна набліжана да методыкі навучання пераказу. Спачатку вучні знаёмяцца са зместам тэксту. У падрыхтоўчай гутарцы неабходна засяродзіць увагу вучняў на тым, якія расліны сланечніку, як яны растуць, для чаго выкарыстоўваюцца. Вучні чытаюць тэкст самастойна ці ланцужком у залежнасці ад падрыхтаванасці. Пасля чытання тэксту вучні адказваюць на пытанне настаўніка, што іх уразіла ў творы. Потым задаюць пытанні па змесце і франтальна адказваюць на іх.

Пасля гэтага разгортваецца работа па арфаграфічнай падрыхтоўцы вучняў. Спосабы тлумачэння прапушчаных літар могуць быць абраныя настаўнікам у залежнасці ад ўзроўню сфарміраванасці ў вучняў арфаграфічных навыкаў (франтальна арганізаванае тлумачэнне слоў з пропускамі літар, выпісванне слоў у групы па відах правілаў, тлумачэнне правапісу слоў у парах і г. д.).

Працягваецца работа вызначэннем структуры тэксту. Настаўнік запытваецца: «Колькі частак у тэксце? Пра што гаворыцца ў кожнай?» Вучні чытаюць загалоўкі частак. (Лепш напісаць іх на дошцы без нумароў, таму што ў вучэбным дапаможніку яны няправільна пранумараваны.) Вучні суадносяць загалоўкі са зместам частак. Выбіраюць адну з частак і рыхтуюць яе пераказ. Для праверкі пераказу да дошкі выклікаюцца тры вучні, якія паслядоўна пераказваюць часткі тэксту. Пасля гэтага вучні фарміруюць групы па тры чалавекі і пераказваюць тэкст па групах.

На апошнім этапе выконваецца пісьмовае заданне, пададзенае ў вучэбным дапаможніку. Пры яго выкананні трэба кіравацца алгарытмам запісу пад дыктоўку на форзацы.

**4. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 108, практ. 176. Разам з вучнямі трэба звярнуцца да тлумачальнага слоўніка ў падручніку і вызначыць, што абазначае слова *будзень*. Потым настаўнік чытае верш і адказвае на пытанні вучняў па яго змесце.

**5. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Як перадаюцца на пісьме гукі [д] і [дз']? Якія літары «дапамагаюць» перадаць цвёрдасць [д] і мяккасць [дз']?

## Урок 37. Гукі [т] і [ц']. Іх абазначэнне на пісьме

***Мэты ўрока:*** адпрацоўваць правільнае вымаўленне гукаў [т], [ц'] і слоў з імі; фарміраваць уменне абазначаць гукі [т], [ц'] на пісьме, абгрунтоўваць напісанне літар ***т***, ***ц*** у словах з апорай на схему; развіваць фанематычны слых, вымаўленчыя навыкі; выпрацоўваць уменне пісаць пад дыктоўку, ажыццяўляць узаемаправерку; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць цікавасць да вывучэння беларускай мовы.

***Абсталяванне:*** карткі са схемай «Правапіс ***т — ц***» (для кожнага вучня); карткі з заданнем для самастойнай работы.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання.**

***Практыкаванне 176.***

Адзін вучань чытае верш услых. Настаўнік задае пытанне: «Што вы даведаліся пра хлопчыка і дзяўчынку?» Затым вучні па ланцужку тлумачаць правапіс слоў з выбарам літар у дужках. *(Будзень, нядзелька, весела, Андрэйка, Надзейка, суседзі, сябры.)*

— Якія правілы правапісу вы ўспаміналі, калі тлумачылі правапіс слоў?

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік чытае праблемную сітуацыю на с. 121 у вучэбным дапаможніку. Затым арганізуецца абмеркаванне сітуацыі па пытаннях:

— Што здзівіла Чамучыка? *(Чаму запісана «тор**т**», але на «тор**це**».)* Ці ўтвараюць гукі [т] і [ц'] пару па цвёрдасці-мяккасці? Як на пісьме перадаецца гук [т], а якой літарай — гук [ц']?

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік прапануе вучням вызначыць тэму і сфармуляваць мэты ўрока.

***Практыкаванне 177.***

Выкананне задання можа быць арганізавана наступным чынам:

1. Настаўнік прапануе вучням разгледзець першы малюнак і назваць адлюстраваны прадмет, вызначыць апошні гук у гэтым слове. *(Торт, апошні гук у слове — [т].)*

2. Вучні разглядаюць схемы слоў побач з малюнкам і вызначаюць, якая з іх адпавядае слову *торт*. *(Першая схема.)*

3. Вучні чытаюць подпіс пад малюнкам. *(На торце.)* Настаўнік задае пытанні:

— Які гук змяніўся ў слове *торт*? *(На месцы гука [т] вымаўляем гук [ц'].)* Якой літарай гук [ц'] абазначаны на пісьме? *(Літарай **ц**.)*

4. Адзін вучань на дошцы, а астатнія ў сшытках запісваюць пару слоў *торт — на торце*, падкрэсліваюць літары, якімі на пісьме перадаюцца гукі [т] і [ц'].

Аналагічна разбіраецца другая пара слоў: *ракета — на ракеце*.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Настаўнік чытае інфармацыю з рубрыкі «Трэба ведаць» (с. 122).

— Ахарактарызуйце гук [т]. Якой літарай на пісьме перадаецца гэты гук? Якія літары пішуцца пасля ***т***.

— Ахарактарызуйце гук [ц']. Якой літарай на пісьме перадаецца гук [ц']? Якія літары пішуцца пасля літары ***ц***, якая абазначае гук [ц']?

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 178.***

Настаўнік прапануе вучням разгледзець схему «Правапіс ***т — ц***» і дапоўніць яе патрэбнай інфармацыяй. Для кожнага вучня можна падрыхтаваць

картку, на якой яны зробяць адпаведныя дапаўненні, і будуць карыстацца ёй пры выкананні іншых практыкаванняў.

Узор карткі:

1. Вымаўляю слова.
2. Вызначаю, які гук у слове:

цвёрды [__] → пішу *т* (пасля *т* пішуцца __, __, __, __, __).

мяккі [__] → пішу __ (пасля __ пішуцца __, __, __, __, __, __).

Выкананне пісьмовага задання арганізуецца каля дошкі з каменціраваннем. Вучні з апорай на схему расказваюць, якія літары прапушчаны ў словах. *(Дзеці, птушка, лета, дзяцел.)* На дошцы і ў сшытках вучні запісваюць толькі словы з гукам [ц'].

***Практыкаванне 179.***

Настаўнік выразна чытае верш, вучні ўважліва слухаюць. Затым настаўнік прапануе расказаць, якую карціну ўявілі.

Кожны вучань чытае верш самастойна, пасля чаго вучні вымаўляюць словы з прапушчанымі літарамі, называюць гук, які вымаўляецца на месцы сняжынкі, і літару, якой яго трэба абазначыць на пісьме. Такім чынам паслядоўна разбіраецца кожнае слова. Два вучні запісваюць словы пад дыктоўку з адваротнага боку, а астатнія вучні — у сшытках; падкрэсліваюць літары, якія абазначаюць зычныя гукі. *(Вецер, ляцяць, цемра, сцяжынку, пашукаць.)* Вучні абменьваюцца сшыткамі і выконваюць узаемаправерку.

***Выкананне самастойнай работы.***

Кожны вучань атрымлівае картку з заданнем.

На сняжынках зафарбуйце алоўкам блакітнага колеру словы, у якіх прапушчана літара *ц*, што абазначае гук [ц'].




**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 123, практ. 180. Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, што для таго, каб скласці слова-адгадку, неабходна выбраць патрэбныя літары ў лужках.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Назавіце словы з гукам [т]. Якой літарай на пісьме перадаецца гук [т]? Якія літары пішуцца пасля *т*? Назавіце словы з гукам [ц']. Якой літарай на пісьме перадаецца гук [ц']? Якія літары пішуцца пасля літары *ц*, якая абазначае гук [ц']?

## Урок 38. Гук [ц']. Яго абазначэнне на пісьме

***Мэты ўрока:*** адпрацоўваць правільнае вымаўленне гукаў [т], [ц'] і слоў з імі; фарміраваць уменне абазначаць гук [ц'] на пісьме; развіваць фанематычны слых, вымаўленчыя навыкі; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць цікавасць да вывучэння беларускай мовы.

***Абсталяванне:*** фотаздымкі, на якіх адлюстраваны розныя калыскі, начоўкі;

карткі з заданнем «Перакладчык».

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 180.***

Вучань услых чытае загадку і называе адгадку. Настаўнік просіць аргументаваць, чаму адгадкай з'яўляецца слова *зямля*.

Вучні тлумачаць правапіс слова *зямля*. Узор разважанняў вучня: «Вымаўляю слова — [з'амл'а]. Вызначаю націскны склад — націск падае на другі склад. У першым складзе перад націскам замест літары ***е*** пішу ***я***».

— Якія словы з гукам [ц'] сустрэліся ў загадцы? *(Корміць, есці, просіць.)* Ахарактарызуйце гук [ц']. *(Зычны, мяккі, глухі.)* Якой літарай на пісьме перадаецца гук [ц']? *(Літарай **ц**.)* Якія літары пішуцца пасля літары ***ц***, якая абазначае гук [ц']? *(Літары **е**, **ё**, **і**, **ю**, **я**, **ь**.)*

Вучні могуць характарызаваць гук [ц'] з апорай на схему на форзацы 1 вучэбнага дапаможніка.

**3. Этап паведамлення тэмы і мэт урока.**

Настаўнік аб'яўляе тэму ўрока: «Гук [ц']. Яго абазначэнне на пісьме»; прапануе вучням самастойна сфармуляваць мэты ўрока, пры неабходнасці ўдакладняе іх.

**4. Этап замацавання.**

***Практыкаванне 181.***

Вучні называюць прадметы, адлюстраваныя на малюнках. Затым праводзіцца частковы гукавы аналіз слоў.

— Вымавіце першае слова. Выдзеліце першы гук у слове *талерка*. *([**ттт**алерка].)* Які першы гук у гэтым слове? *(Гук [т].)* Якой літарай яго трэба абазначыць на пісьме? *(Літарай **т**.)*

Адзін вучань запісвае слова на дошцы, падкрэслівае ***т*** разам з наступнай літарай. Астатнія вучні запісваюць слова ў сшытках. Аналагічна разбіраецца кожнае слова. *(Талерка, цягнік, цюльпан, тапкі, туфлі.)* Каля дошкі працуюць розныя вучні.

***Практыкаванне 182.***

Перад выкананнем практыкавання праводзіцца гутарка па пытаннях:

— Ці ведаеце вы якія-небудзь калыханкі? Дзе вы іх чулі? Хто і калі вам іх спяваў? Для чаго патрэбныя калыханкі?

Настаўнік чытае пераблытаныя радкі калыханкі з практыкавання, пасля чаго вучні чытаюць іх яшчэ раз самастойна і размяшчаюць у патрэбнай паслядоўнасці. Арганізуецца праца па выпрацоўцы выразнага чытання калыханкі, настаўнік прапануе вучням праспяваць калыханку.

— Знайдзіце ў калыханцы словы з гукам [ц'], вымавіце іх. *(Начаваць, коцік, цябе, качаць.)* Якой літарай гук [ц'] абазначаны на пісьме? Якія літары запісаны пасля літары ***ц*** у словах з калыханкі?

Кожны вучань самастойна спісвае калыханку, падкрэслівае літару ***ц*** разам з наступнай літарай. Настаўнік тлумачыць, што радкі калыханкі трэба запісаць у слупок. Можна арганізаваць каменціраванае спісванне.

***Практыкаванне 183.***

Вучні разглядаюць фотаздымак у вучэбным дапаможніку на с. 125 і выказваюць свае меркаванні адносна таго, што на ім адлюстравана. Затым адзін вучань чытае тэкст услых.

Праводзіцца лексічная праца. Настаўнік задае пытанні:

— Значэнне якіх слоў вы не зразумелі? Ці бачылі вы калі-небудзь начоўкі? Як яны выглядаюць? (Вучні чытаюць тлумачэнне слова *начоўкі* ў слоўніку ў канцы вучэбнага дапаможніка. Настаўнік дэманструе малюнак з начоўкамі.) Як вы разумееце значэнне слова *гайдалася*? *(Гайдацца — рытмічна хістацца з боку ў бок.)* Якое слова, блізкае па значэнні да слова *калыска*, ужываецца ў тэксце? *(Люлька.)*

Настаўнік прапануе разгледзець фотаздымкі, на якіх адлюстраваны сучасныя калыскі і тыя, што былі раней. Вучні разглядаюць фотаздымкі і адказваюць на пытанні з апорай на змест тэсту, які прачыталі.

— Знайдзіце і пакажыце фотаздымкі з сучаснымі калыскамі. Ці падобныя гэтыя калыскі на тыя, што былі раней? З чаго рабілі калыскі раней? Чаму калыскі звычайна падвешвалі? Як вы думаеце, дзе можна зараз убачыць калыскі ў выглядзе начовак, калыскі з дошак, лазы? *(У музеях.)*

Пасля аналізу зместу тэксту абмяркоўваецца правапіс слоў з прапушчанымі літарамі (з літарамі, закрытымі зорачкамі). Вучні называюць словы і тлумачаць іх правапіс. Узор разважанняў вучня: «Вымаўляю слова — [с'п'іц']. На канцы слова вымаўляю гук [ц']. На пісьме яго трэба абазначыць літарай ***ц***. Пасля ***ц*** пішу літару ***ь***. Яна ўказвае на мяккасць папярэдняга зычнага гука». Запіс слоў праводзіцца на дошцы і ў сшытках. *(Спіць, дзіця, цяперашнія, пасцелькі, бацькі, прыладзіць, дзіця.)*

***Практыкаванне 184.***

Спачатку вучні выконваюць заданне вусна. Настаўнік звяртае ўвагу на тое, што словы, якія абазначаюць адлюстраваныя на малюнках прадметы, неабходна змяняць, як патрабуе сэнс сказа. Выслухоўваюцца розныя варыянты сказаў, якія склалі вучні. (Магчымыя варыянты сказаў: *Я мару палятаць на верталёце. Навіны можна прачытаць у газеце. Пісьмо дасылаюць у канверце. Мой брат навучыўся ездзіць на скейце. Дзеці адпачывалі ў хаце.*) Два сказы на выбар настаўніка вучні запісваюцца з каменціраваннем на дошцы і ў сшытках, падкрэсліваюць у словах літару, якая абазначае гук [ц'], і літару пасля яе.

***Заданне «Перакладчык».***

Кожны вучань атрымлівае картку з заданнем.

> Прачытайце словы. Перакладзіце іх на беларускую мову і запішыце.
>
> дзеці — ____________ Настя — ____________
> ветер — ____________ самалёты — ____________
> букеты — ____________ думать — ____________

Праводзіцца калектыўная праверка выкананага задання.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 126, практ. 185. Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, што верш трэба запісаць у слупок; толькі першае слова ў першым радку неабходна пісаць з вялікай літары.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Ахарактарызуйце гук [ц']. Прывядзіце прыклады слоў з гэтым гукам. Якой літарай на пісьме перадаецца гук [ц']?

## Урок 39. Гук [ц']. Яго абазначэнне на пісьме

***Мэты ўрока:*** адпрацоўваць правільнае вымаўленне гукаў [ц'], [дз'] і слоў з імі, уменне правільна абазначаць гук [ц'] на пісьме; развіваць фанематычны слых, вымаўленчыя навыкі; пазнаёміць са слоўнікавым словам *чацвер*; узбагачаць слоўнікавы запас прыказкамі; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць клапатлівыя адносіны да іншых.

***Абсталяванне:*** картка са слоўнікавым словам *чацвер*; малюнак ці фотаздымак расліны сівец; карткі з заданнем для работы ў парах.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 185.***

Пасля прачытання верша вучні вымаўляюць словы з гукам [ц'], называюць літару, якой ён перадаецца на пісьме. Арганізуецца ўзаемаправерка выкананага пісьмовага задання.

— Знайдзіце ў вершы словы, якія адрозніваюць адной літарай. *(Спіць — сніць.)* Якія гукі абазначаюць гэтыя літары? *([п'] — [н'].)*

***Выкананне задання на картках у парах.***

— Вучням неабходна было скласці схему слова *цецярук**. Хто выканаў заданне правільна? Адзначце [+] правільны адказ.




* У часопісе колеры пазначаны літарамі.

Арганізуецца калектыўнае абмеркаванне адзначаных варыянтаў адказаў, вызначаецца правільны адказ. *(Правільна схему слова «цецярук» склала Сафія.)*

— Колькі гукаў [ц'] у слове цецярук? *(Два гукі.)* Ахарактарызуйце гук [ц']. *(Зычны, мяккі, глухі.)* Якім колерам трэба пазначыць гук [ц'] на схеме? *(Зялёным.)* Ці ёсць у мяккага зычнага гука [ц'] парны па цвёрдасці зычны гук? *(Няма.)* А парны па звонкасці? *(Ёсць, гук* [дз']*.)*

**3. Этап замацавання.**

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік паведамляе, што на ўроку вучні працягваюць вывучаць тэму «Гук [ц']. Яго абазначэнне на пісьме»; будуць адпрацоўваць правільнае вымаўленне гукаў [ц'], [дз'] і слоў з імі, уменне правільна абазначаць гук [ц'] на пісьме, пазнаёмяцца з новым слоўнікавым словам.

***Практыкаванне 186.***

Вучні разглядаюць малюнкі і чытаюць пары слоў: *сівец — сівець*. Праводзіцца гутарка па пытаннях:

— Растлумачце значэнне слова *сівец*. *(Сівéц — расліна з цвёрдым сцяблом, якая сустракаецца на дрэннай пашы, лузе.)*

Настаўнік прапануе разгледзець малюнак на дошцы і расказаць, як выглядае сівец.

— Як вы разумееце значэнне слова *сівець*? *(Сівець — рабіцца сівым.)* Якімі гукамі адрозніваюцца гэтыя словы? *(*[ц] — [ц']*.)* Ахарактарызуйце гук [ц']. *(Зычны, мяккі, глухі.)* Ахарактарызуйце гук [ц]. *(Зычны, цвёрды, глухі.)* Ці ўтвараюць гукі [ц] — [ц'] пару па цвёрдасці-мяккасці? *(Не ўтвараюць.)* Запішыце слова з гукам [ц']. *(Сівець.)*

Аналагічна арганізуецца праца з кожнай парай слоў: вучні тлумачаць значэнне слоў, вызначаюць слова з гукам [ц'], запісваюць яго і падкрэсліваюць ***ц*** разам з наступнай літарай. *(Цела, сцены, цяні, месяць.)*

**4. Этап знаёмства са слоўнікавым словам.**

Настаўнік прапануе вучням «разблытаць» павуціну і расшыфраваць слоўнікавае слова:




— Растлумачце значэнне слова *чацвер*. Які гэта дзень тыдня? *(Чацвёрты.)*

— Вымавіце слова *чацвер*. Падзяліце слова на склады. *(*[ча-ц'в'эр]*.)* Колькі складоў у гэтым слове? *(2.)* Вымавіце слова, выдзяляючы голасам націскны склад. На які склад падае націск? *(На другі склад —* [ц'в'эр]*.)* Назавіце гукі па парадку. *(*[ч] [а] [ц'] [в'] [э] [р]*.)* Колькі мяккіх зычных гукаў у слове? Якія? *(*[ц'], [в']*.)* Які апошні гук у гэтым слове? *(Гук* [р]*.)*

Настаўнік запісвае слова на дошцы або вывешвае картку са слоўнікавым словам.

| ча**цв**éр |
|---|

Вучні чытаюць слова так, як яно запісана. Вызначаюць, ці супадае вымаўленне і напісанне слова. Настаўнік звяртае ўвагу на тое, што літару ***ь*** пасля ***ц*** не пішам, нягледзячы на тое, што вымаўляем гук [ц'].

У сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя варта звярнуць увагу вучняў на літару ***р*** на канцы слова, каб пазбегнуць памылак ў напісанні слова пад уплывам рускай мовы.

Вучні запісваць у сшытак слова *чацвер*, ставяць націск, падкрэсліваюць літары ***цв***.

Настаўнік прапануе вучням вусна скласці сказ са словам *чацвер*.

***Практыкаванне 187.***

Адзін вучань чытае скорагаворку ўслых. Затым адпрацоўваецца яе правільнае вымаўленне.

Кожны вучань самастойна запісвае слоўнікавае слова, ставіць у ім націск і падкрэслівае літары, якія абазначаюць зычныя гукі. *(Чацвéр.)* Затым арганізуецца ўзаемаправерка выкананага задання.

**5. Этап замацавання.**

***Практыкаванне 188.***

Спачатку вучні чытаюць загадку самастойна, затым дзве вучаніцы чытаюць па ролях.

— Ці правільна адказала Таня? Які дзень ідзе за чацвяргом? *(Пятніца.)* Назавіце па парадку ўсе дні тыдня.

Вучні па ланцужку называюць і запісваюць на дошцы з каменціраваннем назвы дзён тыдня; вызначаюць у словах гукі [ц'] і [дз'], падкрэсліваюць літары, якімі яны перадаюцца на пісьме. *(Панядзелак, аўторак, серада, чацвер, пятніца, субота, нядзеля.)*

***Практыкаванне 189.***

Вучні чытаюць тэкст. Пасля чаго арганізуецца гутарка па яго змесце: «Для каго дзед садзіў яблыні? Аб чым гэта сведчыць?»

Тлумачэнне правапісу слоў з прапушчанымі літарамі можна арганізаваць наступным чынам: вучань чытае слова; называе гук, які вымаўляецца на месцы пропуску ў слове, і літару (або літары), якой (або якімі) яго трэба абазначыць на пісьме. Словы з гукам [ц'] запісваюцца на дошцы і ў сшытках. *(Чакаць, з'ядуць, падзякуюць.)*

***Практыкаванне 190.***

Вучні чытаюць прыказкі і тлумачаць іх сэнс. *(Шануй людзей, то і цябе пашануюць. Калі ты будзеш адносіцца да людзей з павагай, пашанай, то і да цябе так будуць ставіцца. Лепей крышку зрабіць, чым багата нагаварыць. Трэба займацца справай, а не толькі пра яе гаварыць. Сады садзі і ў маладосці, і ў старасці. Дрэвы неабходна садзіць у любым узросце, паколькі яны прынясуць карысць людзям.)*

Вучні ў парах абмяркоўваюць правапіс слоў з выбарам літар. Затым некалькі вучняў услых тлумачаць правапіс слоў. *(Цябе, пашануюць, зрабіць, нагаварыць, у маладосці, у старасці.)*

Вучні вызначаюць прыказку, якая адпавядае тэксту «Дзед і яблыні». Кожны вучань самастойна запісвае прыказку *Сады садзі і ў маладосці, і ў старасці*.

**6. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 129, практ. 191. Настаўнік звяртае ўвагу на тое, што трэба спісаць народную прыкмету, а не толькі словы з прапушчанымі літарамі.

**7. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Прывядзіце прыклады слоў з гукам [ц']; з гукам [дз']. Якой літарай на пісьме перадаецца гук [ц']? А якімі літарамі — гук [дз']? Як абазначаецца мяккасць зычных гукаў [ц'] і [дз'] на пісьме?

## Урок 40. Зацвярдзелыя зычныя гукі

***Мэты ўрока:*** фарміраваць уяўленне пра зацвярдзелыя зычныя гукі; адпрацоўваць правільнае вымаўленне зацвярдзелых зычных гукаў; фарміраваць уменне правільна ўжываць літары, якія абазначаюць галосныя, пасля зацвярдзелых зычных; фарміраваць уменне складаць магчымы працяг тэксту; пазнаёміць са слоўнікавым словам *рукзак*; развіваць фанематычны слых, вымаўленчыя навыкі, звязнае вуснае маўленне, мысленне, фантазію, творчыя здольнасці; выхоўваць клапатлівыя адносіны да птушак.

***Абсталяванне:*** карткі, на якіх пазначаны гукі [дж], [ц], [ч], [р], [ж], [ш]; картка са слоўнікавым словам *рукзак.*

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання.**

***Практыкаванне 191.***

Адзін вучань чытае ўслых народную прыкмету. Настаўнік прапануе вучням прыгадаць, калі ў гэтым годзе былі першыя замаразкі, ці апала на той час лісце з дрэў. Паназіраць, якой будзе зіма, а вынікі назіранняў абмеркаваць вясной.

Праверка выкананага задання праводзіцца франтальна. Вучні называюць, які гук вымаўляецца ў словах на месцы кляновых лістоў, якой літарай яго трэба абазначыць на пісьме. *(Лісце да замаразкаў апала — быць зіме цёплай.)*

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік разам з двума падрыхтаванымі вучнямі чытае праблемную сітуацыю на с. 129 у вучэбным дапаможніку. Настаўнік цікавіцца, ці могуць вучні адказаць на пытанні:

— Якія гукі «падказалі» Чамучыку, што людзі размаўлялі па-беларуску? *(Гукі* [р], [ч].*)* Чаму гэтыя гукі «адметныя»? *(Гэтыя цвёрдыя зычныя гукі не маюць парныя мяккіх гукаў.)* Якія яшчэ цвёрдыя зычныя гукі не маюць парных мяккіх гукаў? (Настаўнік паведамляе, што адказ на гэта пытанне вучні знойдуць на ўроку.)

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік прапануе вучням сфармуляваць тэму і мэты ўрока, пры неабходнасці дапаўняе адказы вучняў.

***Практыкаванне 192.***

*Варыянт 1.* Выкананне задання арганізуецца ў парах. Адзін вучань называе цвёрды зычны, а другі — парны мяккі. Затым заданне правяраецца франтальна.

*Варыянт 2.* Выкананне задання праводзіцца калектыўна. Карткі з гукамі вывешваюцца на дошцы. Вучні аб'ядноўваюць іх у пары і размяшчаюць побач.

Вызначаюцца гукі, якія засталіся без пары. Гэтыя гукі вучні вымаўляюць хорам: [дж], [ц], [ч], [р], [ж], [ш]. Пасля вымаўлення гукаў настаўнік прапануе назваць літары, якімі іх трэба абазначыць на пісьме. Настаўнік запісвае літары на дошцы, а вучні ў сшытках. Вучні называюць словы, у якіх сустракаюцца гукі [дж], [ц], [ч], [р], [ж], [ш].

***Праца са стужкай літар на форзацы.***

— Разгледзьце стужку літар. Як вы думаеце, чаму асобныя літары аб'яднаны ў групу пункцірнай лініяй? На картках якога колеру запісаны гэтыя літары? *(На картках сіняга колеру.)* Што аб'ядноўвае гукі, якія абазначаюць гэтыя літары? *(Гукі, якія абазначаюць гэтыя літары, не маюць парных мяккіх гукаў.)*

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Настаўнік чытае інфармацыю з рубрыкі «Трэба ведаць» (с. 130).

— Пра што новае вы даведаліся з правіла? Якія літары пішуцца пасля ***ж, ш, р, ч, ц*** і спалучэння літар ***дж***?

***Практыкаванне 193.***

Настаўнік прапануе вызначыцца, хто будзе «пілотам», а хто — «касманаўтам». Вучні дадаюць да слоў літару або склад, каб атрымаліся новыя словы. Адзін «пілот» і тры «касманаўты» запісваюць словы на дошцы, астатнія вучні — у сшытках. Затым арганізуецца калектыўная праверка выкананага задання. *(Рыс, рака, грэчка. Ручай, чайнік, сонца, ляшчына, чыгунка, бурак.)* Настаўнік звяртае ўвагу на правільнае вымаўленне зацвярдзелых зычных гукаў у словах.

**4. Этап знаёмства са слоўнікавым словам.**

***Практыкаванне 194.***

Настаўнік прапануе вучням разгадаць рэбус у вучэбным дапаможніку.

Калі вучні разгадваюць рэбус упершыню, то трэба растлумачыць, як правільна гэта зрабіць.

1. Вучні называюць, што адлюстравана на першым малюнку. *(Рука.)*

2. Настаўнік тлумачыць: коска пасля малюнка паказвае, што трэба адкінуць у канцы слова адну літару: ***рук***

3. Вучні называюць літару пасля коскі — ***з***.

4. Вучні называюць, што адлюстравана на другім малюнку. *(Рак.)*

5. Настаўнік тлумачыць: коска перад малюнкам паказвае, што трэба адкінуць у пачатку слова адну літару: ***ак***.

6. Складваем літары і склад у слова: ***рук*** + ***з*** + ***ак***. Атрымліваецца слова ***рукзак***.

— Што такое рукзак? Для чаго ён патрэбны?

Настаўнік абавязкова паказвае ўзор правільнага вымаўлення слова.

**!** *Звяртаем увагу настаўнікаў на тое, што ў слове* ***рукзак*** *вымаўляецца выбухны* [г].

— Вымавіце слова *рукзак* хорам. Падзяліце слова на склады. *(*[ру-гзак].*)* Колькі складоў у гэтым слове? *(2.)* Вымавіце слова, выдзяляючы голасам націскны склад. На які склад падае націск? *(На другі склад —* [гзак].*)* Назавіце гукі па парадку. *(*[р] [у] [г] [з] [а] [к].*)* Колькі зацвярдзелых зычных гукаў у гэтым слове? *(Адзін — гук* [р].*)*

Настаўнік запісвае слова на дошцы або вывешвае картку са слоўнікавым словам.

| рукза́к |
|---|

Вучні чытаюць слова так, як яно запісана. Вызначаюць, ці супадае вымаўленне і напісанне слова. Вучні запісваць у сшытак слова *рукзак*, ставяць націск, падкрэсліваюць літару ***к***.

Настаўнік прапануе вучням вусна скласці сказ са словам *рукзак*.

Вучні дапаўняюць слоўнікавым словам сказ, які прапануецца ў вучэбным дапаможніку, і самастойна запісваюць яго ў сшытку; падкрэсліваюць у словах літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі.

**5. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 195.***

Пасля прачытання першага абзаца тэксту вучні робяць паўзу і дапаўняюць апошні сказ у ім патрэбным словам (з апорай на кантэкст і малюнак) — *снегіры*. Затым вучні чытаюць тэкст да канца. Пасля прачытання тэксту настаўнік прапануе вучням разгледзець малюнак і адказаць на пытанне: «Чым адрозніваюцца птушкі на малюнках?» *(Апярэнне птушак адрозніваецца колерам.)* Калі вучні не ведаюць, чаму ў снегіроў грудкі рознага колеру, настаўнік тлумачыць, што ў самак снегіра грудка шэрая, а ў самцоў — ружова-чырвоная.

Настаўнік прапануе вучням паразважаць, якім можа быць працяг тэксту. Цікавіцца, як вучні дапамагаюць птушкам зімой.

Тлумачэнне правапісу слоў з прапушчанымі літарамі праводзіцца франтальна. Кожны вучань самастойна запісвае словы ў сшытак. *(Кружыліся, сняжынкі, Рыгорка, убачыў, рабіна, прыгожыя, шэрыя, чорныя, брушкі, чырвоныя, снегіры, дрэва, жылі.)*

***Выбарачны слоўнікавы дыктант.***

Настаўнік называе слоўнікавыя словы: *Радзіма, свята, акварыум, месяц, мядзведзь, метро, чацвер*. Вучні запісваюць толькі тыя з іх, у якіх ёсць зацвярдзелы зычны гук. *(Радзіма, акварыум, месяц, метро, чацвер.)*

**6. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 132, практ. 196. Настаўнік звяртае ўвагу на афармленне сказаў у вершаваным тэксце; нагадвае, што верш трэба запісаць у слупок.

**7. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Вымавіце зацвярдзелыя зычныя гукі. Назавіце словы з гэтымі гукамі. Якія літары пішуцца пасля ***ж***, ***ш***, ***р***, ***ч***, ***ц*** і спалучэння літар ***дж***?

## Урок 41. Зацвярдзелыя зычныя гукі

***Мэты ўрока:*** адпрацоўваць правільнае вымаўленне слоў з зацвярдзелымі зычнымі гукамі; фарміраваць уменне правільна ўжываць літары, якія абазначаюць галосныя пасля зацвярдзелых зычных, у прыватнасці, правільна перадаваць на пісьме спалучэнні ***жы***, ***шы***, ***жэ***, ***шэ***, ***цэ***, уменне дзяліць словы для пераносу; фарміраваць уменне знаходзіць у тэксце словы, блізкія па значэнні; выпрацоўваць уменне пісаць пад дыктоўку сказы; развіваць фанематычны слых, вымаўленчыя навыкі, звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць клапатлівыя адносіны да прыроды, жаданне садзіць дрэвы.

***Абсталяванне:*** малюнкі, на якіх адлюстраваны жыта, дрэва грэцкага арэха; грэцкія арэхі; карткі са схемай «Правапіс слоў з зацвярдзелымі зычнымі гукамі».

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 196.***

Вучні чытаюць верш і тлумачаць, якое значэнне ў ім мае слова *месяц*. *(Гэта спадарожнік Зямлі.)*

Праверка выкананага пісьмовага задання праводзіцца франтальна. Вучні тлумачаць правапіс слоў з прапушчанымі літарамі; называюць словы з зацвярдзелымі зычнымі гукамі ў першым сказе.

**3. Этап актуалізацыі ведаў.**

Настаўнік раздае вучням карткі са схемай «Правапіс слоў з зацвярдзелымі зычнымі гукамі» і прапануе запоўніць пропускі. Затым арганізуецца калектыўная праверка выкананага задання.

Узор карткі:

1. Вымаўляю слова.
2. Вызначаю зацвярдзелы зычны гук.

↓ ↓ ↓ ↓ ↓ ↓

[ж] [ш] [дж] [р] [ч] [ц]

↓ ↓ ↓ ↓ ↓ ↓

3. Пішу ___, **ш**, ___, **р**, **ч**, ___.
4. Пасля ___, **ш**, ___, **р**, **ч**, ___ пішу літары ___, ___, ___, ___, ___.

**4. Этап замацавання.**

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік паведамляе, што вучні працягваюць вывучаць тэму «Зацвярдзелыя зычныя гукі»; будуць адпрацоўваць правільнае вымаўленне слоў з зацвярдзелымі зычнымі гукамі, уменне правільна ўжываць літары, якія абазначаюць галосныя пасля зацвярдзелых зычных, замацуюць уменне дзяліць словы для пераносу, папрактыкуюцца ў запісе пад дыктоўку сказаў.

***Практыкаванне 197.***

Вучні вызначаюць, які склад прапушчаны ў словах кожнага слупка, чытаюць словы, якія атрымаліся. *(Жыта, жывот, жывёла. Цішыня, вяршыня, гарошына.)* Варта пацікавіцца, ці ведаюць дзеці значэнне слова *жыта*. Пры неабходнасці настаўнік удакладняе значэнне слова, паказвае адпаведны малюнак. *(Жыта — расліна, зерне якой ідзе на выпечку хлеба. Так называюць і зерне гэтай расліны.)*

— Якую літары неабходна напісаць пасля ***ж*** і ***ш*** у словах, якія вы назвалі? Чаму?

Вучні самастойна запісваюць на выбар па два словы з кожнага слупка, падкрэсліваюць у словах літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі і галосныя пасля іх.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Вучні чытаюць інфармацыю з рубрыкі «Важная інфармацыя» (с. 133). Затым арганізуецца яе абмеркаванне па пытаннях:

— Ці супадае правапіс спалучэнняў ***жы***, ***шы*** ў беларускай і рускай мовах? На напісанне якіх іншых спалучэнняў літар звяртаецца ўвага ў рубрыцы?

***Практыкаванне 198.***

Пасля прачытання верша праводзіцца аналіз яго зместу:

— Што вы ўявілі, калі слухалі верш? Ці супалі вашы ўяўленні з малюнкам у вучэбным дапаможніку на с. 134? З кім аўтар параўноўвае ялінкі? Чаму? Як аўтар апісвае ялінкі? Якія словы, аднолькавыя па значэнні, сустрэліся ў вершы? *(Дзяўчынкі, дзяўчаткі.)* За што ялінкі ўдзячныя хлопчыкам і дзяўчынкам? З якой інтанацыяй трэба прачытаць словы падзякі? (Адзін вучань выразна чытае адпаведныя радкі з верша.)

Пасля аналізу зместу верша вучні тлумачаць правапіс слоў з прапушчанымі літарамі. Вучань, які

называе слова, тлумачыць яго правапіс і запісвае на дошцы, падзяляючы для пераносу. Астатнія вучні запісваюць словы ў сшытках. *(Сця-жын-кі (*або *сця-жы-нкі), дзяў-чын-кі (*або *дзяў-чы-нкі), зя-лё-ныя, хлоп-чы-кі (*або *хло-пчы-кі), дзяў-чат-кі (*або *дзяў-ча-ткі).)* Такім чынам паслядоўна арганізуецца тлумачэнне правапісу кожнага слова рознымі вучнямі. Некаторыя словы, прапанавыя для запісу, можна падзяліць для пераносу рознымі спосабамі. Варта абмеркаваць з вучнямі ўсе магчымыя варыянты, а запісаць словы з падзелам для пераносу толькі адным спосабам (на выбар вучня).

***Практыкаванне 199.***

Настаўнік прапануе вучням самастойна прачытаць тэкст і адказаць на пытанне: «Чаму радаваўся дзядуля?» Больш падрабязны аналіз зместу тэксту можна правесці з апорай на наступныя пытанні:

— Якое дрэва вырашыў пасадзіць дзед? Ці бачылі вы, як выглядае дрэва грэцкага арэха? (Настаўнік паказвае малюнак, на якім адлюстравана дрэва грэцкага арэха, а таксама плады з гэтага дрэва.) Прачытайце ў тэксце, як унукі дапамагалі дзядулю. Якімі словамі вы ахарактарызавалі б унукаў? *(Працавітыя, клапатлівыя, старанныя, уважлівыя.)*

Тлумачэнне правапісу слоў з прапушчанымі літарамі праводзіцца франтальна. Узор тлумачэння вучня: «Вымаўляю слова — [грэцк'і]. У слове зацвярдзелы зычны гук [р]. Пасля літары ***р*** пішу ***э***».

Перад запісам пад дыктоўку сказаў *Жэня выкапаў ямку. Крысціна роўненька трымала дрэўца.* варта прыгадаць алгарытм пісьма пад дыктоўку (звярнуцца да форзаца 2 у вучэбным дапаможніку). Пасля запісу сказаў вучні падкрэсліваюць у словах літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі. Можна арганізаваць узаемаправерку выкананага задання.

***Практыкаванне 200.***

Настаўнік цікавіцца ў вучняў:

— Ці ўдзельнічалі вы калі-небудзь у пасадцы дрэў? Калі і як гэта адбывалася? Раскажыце, навошта людзі садзяць дрэвы.

Пасля гутаркі вучні чытаюць сказы з практыкавання і вызначаюць іх правільную паслядоўнасць. *(Выбраць саджанец і вызначыць месца для пасадкі. Выкапаць яму. Паставіць саджанец і засыпаць карэнне зямлёй. Паліць дрэўца вадой.)* Затым вучні расказваюць тэкст, які атрымаўся. Настаўнік можа прапанаваць вучням разам пасадзіць якое-небудзь дрэва побач са школай вясной.

Кожны вучань самастойна вызначае словы з зацвярдзелымі зычнымі гукамі і запісвае іх у сшытак; два вучні выконваюць заданне з адваротнага боку дошку. *(Саджанец, карэнне, дрэўца, выбраць, вызначыць, месца.)* Пасля выканання задання арганізуецца калектыўная праверка.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 135, практ. 201. Настаўнік звяртае ўвагу на тое, што скорагаворку трэба запісаць у слупок; дома патрэніравацца правільна яе вымаўляць.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Назавіце словы з зацвярдзелымі зычнымі гукамі. Якія літары пішуцца пасля ***ж***, ***ш***, ***р***, ***ч***, ***ц*** і спалучэння літар ***дж***? Чым адрозніваецца напісанне спалучэнняў ***жы***, ***шы***, ***жэ***, ***шэ***, ***цэ*** ў беларускай і рускай мовах?

## Урок 42. Зацвярдзелыя зычныя гукі. Тэматычная кантрольная работа

***Мэты ўрока:*** фарміраваць уменне адрозніваць гукі [ц], [ц'], правільна іх вымаўляць і перадаваць на пісьме; адпрацоўваць навык правапісу слоў з ***я*** ў першым складзе перад націскам, з зацвярдзелымі зычнымі гукамі, з гукам [дз']; выпрацоўваць уменне пісаць пад дыктоўку, ажыццяўляць групоўку; узбагачаць слоўнікавы запіс прыказкамі; развіваць фанематычны слых, вымаўленчыя навыкі, звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць беражлівыя адносіны да прыроды; праверыць веды і сфарміраваныя ўменні па пройдзеным матэрыяле па раздзеле «Гукі і літары».

***Абсталяванне:*** карта Рэспублікі Беларусі; малюнак, на якім адлюстравана шыпшына падчас цвіцення; карткі з заданнямі для кантрольнай работы.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 201.***

Арганізуецца конкурс на лепшага чытача скорагаворкі.

Настаўнік цікавіцца ў вучняў, ці бачылі яны, як цвіце шыпшына, што нагадваюць яе кветкі. Настаўнік можа прадэманстраваць малюнак, на якім адлюстравана шыпшына ў час цвіцення.

Вучні тлумачаць правапіс слоў *машыны*, *шыны*, *шыпы*, *шыпшыны*; прыгадваюць правіла правапісу слоў з зацвярдзелымі зычнымі гукамі.

**3. Этап выканання камбінаванай кантрольнай работы*.**

Кантрольная работа выконваецца кожным вучнем самастойна ў сшытку для кантрольных работ.

Перад выкананнем кантрольнай работы настаўнік каменцірує заданні, якія павінны выканаць вучні.

Заданне 1 (адпавядае трэцяму ўзроўню вучэбнай дзейнасці).

Спішыце словы, падзяляючы іх на склады. Вызначыце націскны склад.

*Варыянт 1:* жураўлі, людзі, яліна.

*Варыянт 2:* шпакоўня, ягады, дзюба.

Заданне 2 (адпавядае трэцяму ўзроўню вучэбнай дзейнасці).

Спішыце. Устаўце ў словы літары галосных гукаў.

*Варыянт 1:* ш..пт, леб..дзь, в..селле.

*Варыянт 2:* кам..ні, в..сна, с..рца.

Заданне 3 (адпавядае трэцяму ўзроўню вучэбнай дзейнасці).

Спішыце сказ. Устаўце замест пропускаў літару ***у*** або ***ў***.

* Распрацавана ў адпаведнасці з «Метадычнымі ўказаннямі па арганізацыі кантролю і ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбных прадметах пры асваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі, прымяненні норм ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў па вучэбных прадметах», зацверджанымі намеснікам міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь А. В. Кадлубаем 15 верасня 2022 г.

*Варыянт 1:* Па..лік до..га вуч.. ..рокі.

*Варыянт 2:* Дзяд..ля падзякава.. ..нуку за падар..нак.

Заданне 4 (адпавядае чацвёртаму ўзроўню вучэбнай дзейнасці).

Спішыце. Падкрэсліце ў словах літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі і галосныя пасля іх.

*Варыянт 1:*

У пушчы мы бачылі зубра, дзіка і зайца.

*Варыянт 2:*

У рацэ жылі шчупакі, самы і акуні.

Заданне 5 (адпавядае пятаму ўзроўню вучэбнай дзейнасці).

Спішыце сказ, дапісваючы патрэбнае слова.

*Варыянт 1:*

Магутны дуб трымаўся за зямлю моцным ка_____ .

*Варыянт 2:*

У пчаліных ву_____ захоўваецца мёд у сотах.

**4. Этап замацавання.**

**!** *Колькасць і паслядоўнасць практыкаванняў, якія будуць выкананы на ўроку, кожны настаўнік вызначае самастойна, арыентуючыся на ўзровень падрыхтаванасці вучняў класа.*

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік паведамляе вучням, што яны працягваюць вывучэнне тэмы «Зацвярдзелыя зычныя гукі»; замацуюць уменне правільна ўжываць літары, якія абазначаюць галосныя пасля зацвярдзелых зычных, адпрацуюць некаторыя вывучаныя правілы правапісу.

***Практыкаванне 202.***

Выкананне задання спачатку арганізуецца ў парах: вучні чытаюць словы і абмяркоўваюць, па якой прымеце яны аб'яднаны ў групы. Некалькі вучняў выказваюць свае меркаванні, аргументуюць адказ.

Настаўнік прапануе прачытаць словы, запісаныя ў першым слупку, і адказаць на пытанне: «Які гук абазначаны літарай ***ц*** у гэтых словах?» *(Гук* [ц]*.)* Затым вучні чытаюць словы, запісаныя ў другім слупку, і вызначаюць, які гук абазначаны літарай ***ц*** у гэтых словах. *(Гук* [ц']*.)* Кожны вучань самастойна запісвае словы з гукам [ц]. *(Цукар, цэгла, цырк.)*

Вучні характарызуюць гукі [ц], [ц']. *(Гук* [ц] *— зычны, цвёрды, глухі. Гук* [ц'] *— зычны, мяккі, глухі.)* Завяршаецца выкананне практыкавання вывадам, які фармулююць вучні: гук [ц] і гук [ц'] на пісьме абазначаецца адной літарай — літарай ***ц***.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Вучні чытаюць інфармацыю з рубрыкі «Важная інфармацыя» (с. 136).

— Ці ўтвараюць гукі [ц], [ц'] пару па цвёрдасці-мяккасці? Якой літарай на пісьме абазначаюцца гэтыя гукі?

***Практыкаванне 203.***

Вучні па ланцужку чытаюць словы і вызначаюць, які гук абазначае літара ***ц*** у кожным слове. Пры вымаўленні слоў вучні голасам выдзяляюць гукі [ц], [ц'].

Выкананне пісьмовага задання арганізуецца каля дошкі з каменціраваннем. Вучань, які вымаўляе слова, запісвае яго ў адпаведную групу. Словы можна размеркаваць у два слупкі. Два апошнія словы з практыкавання пажадана прапанаваць вучням запісаць самастойна. Затым вучні тлумачаць, якое слова трапіла ў абедзве групы і чаму. *(У слове «мяцеліца» ёсць гук* [ц'] *і гук* [ц] *— мя*[ц']*елі*[ц]*а.)*

| | |
|---|---|
| цуд | вецер |
| канцэрт | маці |
| станцыя | сцюжа |
| пшаніца | мяцеліца |
| мяцеліца | кацяня |

***Практыкаванне 204.***

Вучні складаюць прыказкі з частак і тлумачаць іх сэнс. *(Трэба рана ўстаць, каб хлеба прычакаць. Каб атрымаць добры ўраджай, добрыя вынікі ад любой справы, трэба шмат часу папрацаваць. Цяжка таму жыць, хто ад працы бяжыць. Дабрабыт чалавека залежыць ад таго, як ён працуе; без руплівай працы няма вынікаў, поспеху.)*

Вучні тлумачаць правапіс слоў з прапушчанымі літарамі; прыгадваюць, якія літары галосных гукаў пішуцца пасля літар, што абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі.

Настаўнік разам з вучнямі вызначае, якую прыказку будуць запісваць пад дыктоўку. Падчас запісу пад дыктоўку настаўнік абавязкова папярэджвае пра пастаноўку коскі ў сказе. Кожны вучань самастойна падкрэслівае літару ***ц***, якая абазначае гук [ц], адной рыскай, а літару, якая абазначае гук [ц'], — дзвюма рыскамі.

***Практыкаванне 205.***

Настаўнік прапануе вучням разгледзець малюнак у вучэбным дапаможніку, назваць птушку і апісаць, як яна выглядае. (На дошцы можна запісаць апорныя словы з тэксту: *У сініцы чорная галава з сінім адлівам, шчокі белыя. Брушка ў птушкі жоўтага колеру. Па сярэдзіне жоўтага цела чорны «гальштук». Крылы ў птушкі шаравата-блакітныя са светлай папярочнай паласой. Хвост амаль чорны з блакітным напыленнем.*)

Пасля праслухоўвання верша вучні адказваюць на пытанні: «Што сніцца сініцы? Чаму аўтар ужывае слова *цуд*? Успомніце, як выглядаюць суніцы. Калі іх можна пакаштаваць?»

— Знайдзіце ў вершы словы з гукам [ц']. *(Цінькае, гасцюе, цёпла.)* У якіх словах вымаўляецца гук [ц]? *(Сініца, цэлы, месяц, сніцца (у слове вымаўляем «доўгі» гук* [ц]*), цуд, сініц, суніц.)*

Калі вучні няправільна вызначаюць слова, настаўнік прапануе вымавіць яго і выдзеліць голасам вызначаны гук ([ц] або [ц']) у цэлым слове.

Кожны вучань самастойна спісвае верш і падкрэслівае ў словах літару ***ц***, якая абазначае гук [ц], адной рыскай, а літару, якая абазначае гук [ц'], — дзвюма рыскамі.

***Практыкаванне 206.***

Настаўнік чытае тэкст, пасля сказа *Ведаеце, якая самая славутая ў Беларусі пушча?* робіць паўзу і выслухоўвае меркаванні вучняў. Пасля прачытання тэксту праводзіцца гутарка па пытаннях:

— Дзе знаходзіцца Белавежская пушча? (Настаўнік паказвае на карце Рэспублікі Беларусь, дзе знаходзіцца Белавежская пушча.) Хто з'яўляецца сімвалам пушчы? Ці бачылі вы калі-небудзь зубра? Дзе? Разгледзьце малюнак у вучэбным дапаможніку. Апішыце зубра. Дакажыце, што зубр дужы, з апорай на змест тэксту. Якімі словамі аўтар характарызуе зубра? Як вы разумееце значэнне слова *рахманы*? *(Рахманы — які не баіцца чалавека; спакойны, нязлосны.)*

— Ці былі вы калі-небудзь у Белавежскай пушчы? Што вам запомнілася? Якіх жывёл акрамя зубра там бачылі?

Вучні ў парах абмяркоўваюць выбар літары ў дужках; прыгадваюць правіла правапісу **ў**. Затым арганізуецца калектыўная праверка. *(Славутая, пушча, галоўная ўкраса, зубр, дужы.)*

Вучні спачатку самастойна вызначаюць, якія правілы неабходна прымяніць для вызначэння напісання слоў з прапушчанымі літарамі, затым кожную групу слоў запісваюць асобна. Выкананне задання арганізуецца на дошцы і ў сшытках.

1-я група. Белаве́жская, на мяжы, белаве́жскі, звяро́ў, насяляюць, вялікі, сцяну́, бярве́нняў, лясно́й.

2-я група. Рэспублікі, пушчы, дрэва, разбурыць, матацыкл, машыну, рэдка.

3-я група. Спыніць, робіць, чапаюць.

4-я група. На захадзе.

**5. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Назавіце словы з гукам [ц]. Ахарактарызуйце гук [ц]. Прывядзіце прыклады слоў з гукам [ц']. Ахарактарызуйце гук [ц']. Якой літарай на пісьме абазначаюцца гукі [ц], [ц']? Якія літары пішуцца пасля літары **ц**, якая абазначае зацвярдзелы гук [ц]?

## Урок 43. Аналіз кантрольнай работы. Звонкія і глухія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме

***Мэта ўрока:*** актуалізаваць веды пра звонкія і глухія зычныя гукі, асаблівасці іх вымаўлення; адпрацоўваць уменне адрозніваць звонкія і глухія зычныя гукі; садзейнічаць засваенню зычных, парных па звонкасці-глухасці; развіваць уменне ажыццяўляць групоўку, працаваць са схемамі; развіваць фанематычны слых, вымаўленчыя навыкі, звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць клапатлівыя адносіны да жывёл.

***Абсталяванне:*** званочак, стужка літар, малюнкі шафы, відэльца, збана, капы, талеркі, дывана; карткі звонкіх зычных (званочак), глухіх зычных (навушнікі); лінейка.

**1. Арганізацыйны этап.**

Азнаямленне вучняў з другой часткай вучэбнага дапаможніка:

— Разгарніце падручнік і скажыце, ці змяніліся ўмоўныя абазначэнні. Які герой застаецца вывучаць з намі беларускую мову? Разгарніце форзац 1. Што на ім змешчана? Разгарніце форзац 2, на якім змешчаны асноўныя правілы і парадак работы над памылкамі, дапушчанымі на гэтыя правілы (паказаны ў прыкладах). Па гэтым форзацы будзем зараз выконваць работу над памылкамі, дапушчанымі ў кантрольнай рабоце.

**2. Этап правядзення аналізу кантрольнай работы.**

Пасля паведамлення абагуленых вынікаў кантрольнай работы вучні запісваюць у сшытках для кантрольных работ назву віду работы «Работа над памылкамі». Настаўнік тлумачыць парадак работы з дапушчанымі памылкамі. Вучні выпісваюць словы, у якіх былі дапушчаны памылкі, на дошцы і ў сшытках (каля дошкі працуюць вучні з ліку тых, хто памылак не зрабіў), тлумачаць правілы і выконваюць работу над памылкамі.

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік звоніць у званочак, просіць прыслухацца і сказаць, пра што можа гаварыць гук званочка. Выслухоўвае адказы вучняў. Прапануе прачытаць, пра што падумаў Чамучык, калі пачуў званочак. Вучні чытаюць праблемную сітуацыю на с. 3 другой часткі вучэбнага дапаможніка і адказваюць на пытанні:

— Ці згодныя вы з Чамучыкам, што ў слове *звонкія* ўсе зычныя гукі звонкія? Якія зычныя гукі з'яўляюцца звонкімі? Глухімі? Назавіце звонкія зычныя ў слове *глухія*.

У якасці падтрымкі настаўнік прапануе вучням карыстацца стужкай літар, якая ёсць у класе. Абагульняючы сказанае, настаўнік дае заданне першаму варыянту назваць усе звонкія зычныя, другому варыянту — глухія зычныя.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Задаецца праблемнае пытанне: «Як адрозніць звонкія і глухія зычныя?» Вучні выказваюць свае прапановы, якія павінны быць абвергнуты ці прыняты падчас выканання практыкаванняў.

***Практыкаванне 1.***

Настаўнік прапануе разгледзець малюнкі і прачытаць словы.

— Якім словам трэба падпісаць кожны малюнак?

Настаўнік дэманструе малюнкі шафы, відэльца, збана, капы, талеркі, дывана па адным, вучні называюць прадметы. Пасля вымаўлення кожнага слова вучні вызначаюць у ім зычныя гукі, гавораць, глухія яны ці звонкія. Потым слова запісваецца ў адзін са слупкоў (слупкі пазначаны адпаведнымі карткамі званочка ці навушнікаў). Калі ў слове ёсць глухія і звонкія зычныя гукі, то яно не запісваецца. Вусна да кожнага слова падбіраюцца словы, якія адказваюць на пытанні я к і? я к а я?.

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на малюнкі і прапануе вызначыць, на якія яшчэ дзве групы можна падзяліць словы (назвы прадметаў інтэр'ера і посуду). Вучні называюць прадметы кожнай групы.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на слупкі слоў, запісаных на дошцы і ў сшытках. Паўтарае праблемнае пытанне, вучні адказваюць. Для самаправеркі настаўнік дае заданне прачытаць правіла і сказаць, што было правільным у адказах вучняў, а што памылковым. Потым вучні чытаюць правіла ўголас.

— Вызначыце ў правіле інфармацыю, пра якую яшчэ не гаварылі. Што вы ведаеце пра парныя і няпарныя звонкія і глухія зычныя гукі?

***Практыкаванне 2.***

Настаўнік арганізуе назіранне вучняў па табліцах практыкавання.

— Якія гукі пазначаны ў першай табліцы? У другой табліцы?

Далей праца ажыццяўляецца з інфармацыяй першай табліцы.

— Назавіце няпарныя звонкія зычныя. Якіх гукаў не хапае? Як здагадаліся? Якія няпарныя звонкія зычныя не маюць парных па мяккасці гукаў?

Аналагічна праводзіцца работа па назіранні над няпарнымі глухімі зычнымі.

Работа з інфармацыяй другой табліцы арганізуецца наступным чынам.

— Назавіце парныя звонкія зычныя, якія ёсць у табліцы. Назавіце парныя глухія зычныя, якія ёсць у табліцы. Падумайце і скажыце, якія парныя звонкія зычныя прапушчаны. Якія парныя глухія зычныя

прапушчаны? Назавіце пары зычных па звонкасці-глухасці. А цяпер наадварот: па глухасці-звонкасці.

Далей па другой табліцы вучні выконваюць заданне «Назаві пару». Вучні лінейкамі закрываюць ніжні рад гукаў і вымаўляюць гукі парамі па парадку, потым закрываюць верхні рад гукаў і называюць пары. Далей гульня арганізуецца ў парах. Спачатку вучні закрываюць адзін з радоў гукаў лінейкай, паказваюць гук, другі вучань называе парны яму. Потым вучні мяняюцца.

На апошнім этапе работы вучні называюць парныя па звонкасці-глухасці зычныя хорам.

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 3.***

Перад самастойным запісам вучнямі слоў праводзіцца работа па ўсведамленні сутнасці задання. Яна адбываецца на матэрыяле першых слоў кожнага радка. Настаўнік запытваецца ў вучняў, што трэба зрабіць «пілотам».

— Вымавіце першае слова радка «пілотаў». Назавіце парны зычны гук. Ён звонкі ці глухі? Які парны яму глухі гук? Падстаўце гук [ш] у слова. Якое слова атрымалася?

Аналагічна разбіраецца слова *твор* радка «касманаўтаў». Вучні самастойна выконваюць заданне — запісваюць словы парамі і падкрэсліваюць літары парных звонкіх і глухіх зычных гукаў. Трэба звярнуць увагу, што заданне «касманаўтаў» ускладнена тым, што патрабуе правільна перадаць на пісьме ***дз*** і запісаць слова *Вольга* з вялікай літары. Пры праверцы выканання задання, якая арганізуецца па групах «пілотаў» і «касманаўтаў», трэба звярнуць на гэта асаблівую ўвагу.

***Практыкаванне 4.***

Настаўнік прапануе вучням прачытаць першы абзац тэксту і сказаць, як звалі хлопчыка і куды ён паехаў на канікулы. Настаўнік заінтрыгоўвае вучняў, гаворачы, што ў тэксце расказваецца пра цуд. Прапануе прачытаць тэкст самастойна і сказаць, які цуд убачыў хлопчык у вёсцы.

Пасля чытання тэксту вучні расказваюць, які цуд убачыў хлопчык. Далей тэкст чытаецца вучнямі ўголас. Настаўнік запытваецца, ці можна лічыць гэта цудам.

— Уявіце сябе на месцы Глеба, што вы раскажаце сябрам, калі прыедзеце ў горад?

— Што нагадвала возера з рыбамі?

Вучні паўтараюць, як пішацца слоўнікавае слова *акварыум*, знайшоўшы яго на форзацы 1.

Работа з выдзеленымі словамі арганізуецца з каменціраваннем:

1. Слова вымаўляецца вучнем выразна. Вызначаецца парны зычны гук.
2. Па стужцы літар вызначаецца, звонкі гэты гук ці глухі.
3. Слова дыктуецца па складах і запісваецца. Літара парнага зычнага падкрэсліваецца. Пажадана назваць парны яму зычны.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 6, практ. 5. Акрамя выканання дамашняга практыкавання настаўнік дае заданне паўтарыць парныя па звонкасці-глухасці зычныя.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

Вучням прапануецца разгледзець схему на дошцы і назваць словы, якія адсутнічаюць. Абвесці словы, што абазначаюць паняцці, пра якія гаварылі на ўроку. Прывесці прыклады гукаў кожнай групы.

— Як адрозніць звонкія і глухія зычныя гукі?




## Урок 44. Парныя звонкія і глухія зычныя гукі

***Мэта ўрока:*** пазнаёміць з асаблівасцямі вымаўлення парных па звонкасці-глухасці зычных на канцы слова і ў сярэдзіне слова перад зычнымі; адпрацоўваць уменне правільна вымаўляць і запісваць словы, у якіх парныя па звонкасці-глухасці зычныя знаходзяцца на канцы слова і ў сярэдзіне слова перад зычнымі; фарміраваць уменне распазнаваць парныя зычныя, якія патрабуюць праверкі; фарміраваць уменне пісаць па памяці і пад дыктоўку; развіваць фанематычны слых, арфаграфічную пільнасць, звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць эстэтычныя пачуцці.

***Абсталяванне:*** малаток, стамеска ці іх выявы; карткі звонкіх і глухіх зычных гукаў.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 6.***

Выкананне практыкавання накіравана на ўсведамленне сэнсаадрознівальнай ролі парных зычных, назіранне за тым, што на канцы і ў сярэдзіне слоў парныя зычныя вымаўляюцца невыразна. Работа арганізуецца з парамі слоў. Вучні называюць выявы на малюнках. Вымаўляюць словы і называюць парны зычны гук, які чуецца. Чытаюць словы і называюць, якой літарай перадаецца парны зычны гук. Потым падбіраюць патрэбныя па сэнсе словы, каб дапоўніць спалучэнні слоў па кропках, арыентуючыся на сэнс. Спалучэнні слоў запісваюцца з каменціраваннем, літары парных зычных гукаў падкрэсліваюцца.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Па запытанні настаўніка вучні вымаўляюць словы з практыкавання парамі, назіраюць, што яны вымаўляюцца аднолькава, а пішуцца па-рознаму. Увага вучняў звяртаецца на рубрыку «Увага» (с. 8). Настаўнік чытае інфармацыю запаволена па частках. Пасля чытання кожнай часткі задае пытанне, якое актуалізуе атрыманую інфармацыю: «Калі парныя звонкія зычныя вымаўляюцца як глухія? Падмацуйце адказ прыкладам з практыкавання, якое выканалі. Калі парныя глухія зычныя вымаўляюцца як звонкія? Таксама падмацуйце адказ прыкладам з гэтага практыкавання».

— На ўроку мы будзем шукаць у словах такія парныя звонкія і глухія зычныя гукі, якія вымаўляюцца не так, як пішуцца. Іх напісанне трэба правяраць.

На гэтым этапе мэтазгодна паўтарыць пары звонкіх і глухіх зычных гукаў.

***Практыкаванне 7.***

Вучні самастойна знаёмяцца з вершам. Па логіцы падбіраюць словы, якія трэба дадаць замест кропак. Вучні чытаюць верш уголас па адным радку, дадаюць слова, тлумачаць, чаму выбралі гэтае слова.

Устаўленыя ў верш словы вымаўляюцца, вызначаецца, які гук чуецца на канцы слова і якой літарай ён абазначаецца.

Вучні самастойна запісваюць радкі верша, якія запомнілі. Праверка ажыццяўляецца калектыўна. У працэсе чытання верша па адным сказе вучні тлумачаць знаёмыя арфаграмы. Падкрэсліваюць літары парных звонкіх і глухіх зычных, напісанне якіх трэба правяраць.

***Практыкаванне 8.***

Настаўнік чытае верш уголас, праводзіць гутарку па яго змесце па пытаннях практыкавання, змешчаных перад вершам. Вучні чытаюць верш па адным сказе і шукаюць словы, у якіх: звонкія зычныя — на канцы і ў сярэдзіне слоў перад глухімі; глухія зычныя — у сярэдзіне слоў перад звонкімі зычнымі.

Мэтазгодна спачатку вызначыць словы з парнымі па звонкасці-глухасці зычнымі, якія стаяць у канцы слова ці ў сярэдзіне слова перад зычным. Гэтыя словы аналізуюцца, даюцца характарыстыкі парных зычных і зычных пасля іх (у сярэдзіне слова). Словы з парнымі зычнымі, напісанне якіх трэба правяраць, запісваюцца ў сшыткі. Літары на месцы гэтых гукаў падкрэсліваюцца.

**3. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 9.***

Перад чытаннем тэксту разглядаецца фотаздымак.

— Якімі інструментамі карыстаецца майстрыха? (Выявы інструментаў замацаваны на дошцы і падпісаны: *малаток, стамеска*.) З якім матэрыялам яна працуе? *(Тоўстая папера.)* Паслухайце тэкст і скажыце, пра якое рамяство ў ім гаворыцца.

Настаўнік чытае тэкст. Тлумачыць словы, якія вучні не зразумелі. Навучэнцы адказваюць на пытанне, потым чытаюць тэкст самастойна і задаюць адзін аднаму пытанні па яго змесце.

Вучні чытаюць тэкст па адным сказе, шукаюць словы з парнымі зычнымі. Праца разгортваецца такім жа чынам, як у папярэднім практыкаванні.

Перад запісам сказаў пад дыктоўку трэба з дапамогай каменціравання растлумачыць у словах усе знаёмыя вучням арфаграмы. Потым сказы запісваюцца пад дыктоўку. Ажыццяўляецца самаправерка па падручніку. У запісаных сказах вучні падкрэсліваюць літары парных па звонкасці-глухасці зычных, напісанне якіх трэба правяраць.

**4. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 10, практ. 10. Настаўнік чытае верш. Запытваецца, пра якое свята ў ім гаворыцца. Просіць вучняў быць уважлівымі і адшукаць у дамашнім практыкаванні словы з парным зычным на канцы слова.

**5. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— У якіх выпадках парныя звонкія зычныя вымаўляюцца як глухія? Парныя глухія зычныя вымаўляюцца як звонкія?

Вучні збіраюць схемы на наборным палатне:



## Урок 45. Парныя звонкія і глухія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме

***Мэта ўрока:*** пазнаёміць са спосабам выбару літары для абазначэння парных па звонкасці-глухасці зычных на канцы слова і ў сярэдзіне слова перад зычнымі, фарміраваць уменне распазнаваць парны зычны, які патрабуе праверкі, і падбіраць праверачныя словы, тлумачыць правапіс слоў; фарміраваць уменне пісаць пад дыктоўку, ажыццяўляць узаемаправерку; пазнаёміць са слоўнікавым словам *калектыў*; узбагачаць слоўнікавы запас прыказкамі; развіваць арфаграфічную пільнасць, звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць жаданне працаваць разам, пачуццё калектывізму.

***Абсталяванне:*** сігнальныя карткі, малюнак ці фота вадалаза.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

Мэтазгодна на пачатку ўрока ў займальнай форме паўтарыць парныя звонкія і глухія зычныя. Асаблівую ўвагу трэба надаць паўтарэнню пар, якія яны ўтвараюць.

Наступны этап праверкі дамашняга задання прысвечаны актуалізацыі выпадкаў, калі напісанне парных зычных трэба правяраць. Вучні называюць словы з верша, у якіх ёсць парныя звонкія і глухія зычныя, напісанне якіх трэба правяраць. Вучні тлумачаць пазіцыю парных зычных гукаў у сярэдзіне перад звонкімі ці глухімі і звонкіх зычных на канцы слова.

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік чытае праблемную сітуацыю. На месцы пералічэння пакупак чытае запаволена, выразна вымаўляе словы па правілах вымаўлення: *ёгур*[т], *хле*[п], *кар*[п], *мё*[т], *тваро*[х], *гаро*[х]. Можна спыніцца і звярнуць увагу вучняў на тое, якія гукі яны пачулі на канцы слоў: «Гэта звонкія ці глухія парныя зычныя?» Потым настаўнік чытае словы, выразна вымаўляючы гукі літар на канцы слоў.

— З якой праблемай сутыкнуўся Чамучык? Чаму трэба яму навучыцца?

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

— Сёння будзем вучыцца правяраць напісанне парных звонкі і глухіх зычных на канцы і ў сярэдзіне слова.

***Практыкаванне 11.***

Для лепшага ўсведамлення зместу скорагаворкі пачаць работу мэтазгодна з ілюстрацыі.

— Каго вы бачыце на малюнку? Чым займаюцца вадалазы? Каб даведацца, як называецца судна на малюнку, разгарніце тлумачальны слоўнік у канцы

падручніка. Знайдзіце тлумачэнне другога слова. Прачытайце, што такое баркас. Як называецца лодка на малюнку? Значэнне якога яшчэ слова з верша трэба паглядзець у слоўніку? Прачытайце значэнне слова *лаз*. Паслухайце скорагаворку.

Першы раз скорагаворку можа прачытаць настаўнік. Потым вучні чытаюць скорагаворку напаўголаса самастойна. Сярод выдзеленых слоў вучні вылучаюць словы, у якіх парныя звонкія і глухія зычныя трэба правяраць. Гэтыя словы трэба выпісаць на дошку. Далей да іх падбіраюцца і запісваюцца словы з верша, якія падказваюць, як трэба гэтыя словы пісаць:

| | |
|---|---|
| Баркас | Лаз |
| пад баркасам | за лазам |

Вучні падкрэсліваюць у другіх словах кожнай пары літару парнага зычнага і галоснага пасля яго.

— Які гук «дапамог» парнаму глухому зычнаму вымаўляцца выразна?

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Настаўнік чытае правіла. Запытваецца, як праверыць напісанне парных звонкіх і глухіх зычных у канцы і ў сярэдзіне слоў. Вучні чытаюць правіла ўголас. Настаўнік прапануе прывесці прыклады слоў для праверкі слоў з праблемнай сітуацыі. *(Ёгур*[т] *— ёгурты, хле*[п] *— хлебапёк, кар*[п] *— карпа, мё*[т] *— мёду, тваро*[х] *— тварагу, гаро*[х] *— гароху.)*

***Практыкаванне 12.***

Работа са схемай арганізуецца франтальна з дапамогай лінейкі ці закладкі. Вучні пакідаюць адкрытым толькі першы пункт плана. Вучань чытае яго змест. Настаўнік прапануе назваць парныя звонкія і глухія зычныя гукі. Далей вучні перамяшчаюць закладку ці лінейку, каб стаў бачны другі пункт схемы.

— Калі абавязкова трэба правяраць напісанне парных звонкіх і глухіх зычных? У якіх выпадках гэтага рабіць не трэба?

Наступны пункт схемы вучні чытаюць хорам, дапаўняюць патрэбным словам. З апошнім пунктам схемы працуюць аналагічна.

Далей праца са схемай арганізуецца па словах з гэтага практыкавання з пропускам літары. Словы падаюцца ў словазлучэннях, каб можна было вызначыць іх значэнне. Пры вымаўленні слова *брат* трэба зафіксаваць увагу вучняў на тым, што вымаўляецца глухі парны зычны гук [т]. Далей вучань адказвае так: «Вызначаю месца парнага зычнага гука ў слове: у канцы слова. Значыць, літару трэба правяраць. Змяняю слова так, каб пасля зычнага стаяў галосны: *брат – браты*. Выразна чую гук [т]. Значыць, у слове *брат* пішу літару ***т***. Пішу: *браты*, падкрэсліваю *ты*. Пішу: брат з літарай ***т***, падкрэсліваю *т*». Аналагічна вучні працуюць з астатнімі словамі. Пажадана даць магчымасць выканаць заданне з павелічэннем самастойнасці вучняў. Напрыклад, правесці работу са словамі ў парах ці самастойна.

***Практыкаванне 13.***

Работа пачынаецца з гутаркі па малюнку:

— Якое надвор'е было напярэдадні? Хто выйшаў чысціць школьны двор? Як працуюць вучні і настаўніца? Чаму ва ўсіх усмешкі? Як вы думаеце, ці хутка зробяць справу настаўніца і вучні? Чаму?

***Работа са слоўнікавым словам.***

— Як можна назваць тых, хто разам працуе, робіць агульную справу, дапамагае адзін аднаму? Слова-падказка ёсць у падручніку. Прачытайце яго: *калектыў*. Падзяліце слова на склады, вызначыце націскны склад. Якое правіла не выконваецца пры напісанні гэтага слова? Як вы думаеце, чаму так пішацца гэта слова? Вымавіце слова па складах. Запішыце, пастаўце націск. Знайдзіце гэта слова на форзацы ў пачатку падручніка. Хто там намаляваны? Чаму?

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 14.***

Вучні чытаюць прыказкі і тлумачаць, чаму, на іх думку, так гавораць.

З першай прыказкай вучні працуюць калектыўна: чытаюць кожнае слова і вызначаюць парныя звонкія і глухія зычныя. Пра словы, у якіх гэтыя гукі стаяць перад галосным, перад ***л***, ***м***, ***н***, ***р***, ***в***, ***й***, вучні гавораць: «Праверка не патрабуецца». Пра іншыя словы яны гавораць: «Праверка патрабуецца. Падбіраю праверачнае слова, каб пасля гэтага зычнага стаяў галосны: ... . Запісваю слова ..., падкрэсліваю ... ».

Калі вучні прадэманструюць дастатковы ўзровень падрыхтаванасці, можна адну-дзве прыказкі даць для самастойнай работы. Але трэба яе калектыўна праверыць.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 14, практ. 15.

— Прачытайце загадку. Хто здагадаўся, дзе знайсці адгадку?

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Як праверыць парныя звонкія і глухія зычныя? Ці заўсёды іх трэба правяраць? З якім слоўнікавым словам пазнаёміліся? Чаму яно слоўнікавае?

## Урок 46. Парныя звонкія і глухія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме

***Мэта ўрока:*** адпрацоўваць уменне правільна вымаўляць і запісваць словы, у якіх парныя па звонкасці-глухасці зычныя знаходзяцца на канцы слова і ў сярэдзіне слова перад зычнымі; фарміраваць уменне падбіраць праверачныя словы, тлумачыць правапіс слоў з зычнымі, парнымі па звонкасці-глухасці; узбагачаць слоўнікавы запас фразеалагізмамі; развіваць арфаграфічную пільнасць, звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць пачуццё гумару.

***Абсталяванне:*** сігнальныя карткі, наборнае палатно з літарамі.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

У займальнай форме прыгадваюцца пары звонкіх і глухіх зычных гукаў.

***Практыкаванне 15.***

Вучні выразна чытаюць загадку, тлумачаць адгадку. Неабходна звярнуць увагу на словы, якія яе падказваюць у змесце загадкі, а не толькі на пачатак яго радкоў: *ветлы, лёгкі, нібы пух*.

У загадцы, запісанай на дошцы, вучні тлумачаць словы з парнымі па звонкасці-глухасці зычнымі, якія трэба правяраць. Спачатку называюць месца парнага гука ў слове, потым называюць праверачнае слова.

Настаўнік прапануе растлумачыць, ці трэба правяраць парны па звонкасці-глухасці зычны ў слове *светлы*. *(Паколькі парны зычны знаходзіцца перад **л**, то правяраць яго не трэба.)*

— Якія яшчэ гукі дазваляюць не правяраць парныя па звонкасці-глухасці зычныя ў сярэдзіне слова?

На наборным палатне выстаўляюцца літары ***л***, ***м***, ***н***, ***р***, ***в***, ***й***.

**3. Этап замацавання вывучанага.**

***Практыкаванне 16.***

— Пра якую зімовую забаву гаварылася ў вершы дамашняга практыкавання? *(Пра катанне на лыжах.)* Якія зімовыя забавы вам найбольш падабаюцца? Прачытайце верш і скажыце, пра што ў ім гаворыцца? Хто рашыў пагуляць у снежкі? Як вы думаеце, што абазначае слова *дол*? Прачытайце ў тлумачальным слоўніку і скажыце, ці правільна мы здагадаліся?

— Як праверыць, якую літару трэба напісаць у словах?

Вучні прыгадваюць алгарытм праверкі парных па звонкасці-глухасці зычных, падбіраюць праверачныя словы і запісваюць пары слоў на дошцы.

Вучні пасля папярэдняй падрыхтоўкі самастойна спісваюць першы сказ. Робяць узаемаправерку.

***Практыкаванне 17.***

Тэкст практыкавання мае жартоўны характар, таму чытаць яго павінны або падрыхтаваныя вучні, або настаўнік. Пасля ўспрымання тэксту вучні тлумачаць, што ў ім жартоўнае.

— Што абазначае выраз *мядзведзь на вуха наступіў*? Якое слоўнікавае слова ён утрымлівае?

Праца са словамі з выбарам літары адбываецца паводле ўзору папярэдняга практыкавання. Вучні запісваюць з каменціраваннем спачатку праверачнае слова і падкрэсліваюць літару парнага і галоснага пасля яго, потым слова з выбарам літары і падкрэсліваюць літару парнага зычнага.

***Практыкаванне 18.***

Перад чытаннем тэксту практыкавання варта назваць прадметы на малюнках, ужытыя ў тэксце.

— Абапіраючыся на малюнкі, падумайце, пра што можа ісці гаворка ў гэтым тэксце.

Чытанне тэксту ланцужком. Вызначэнне значэнняў незразумелых слоў. Пастаноўка пытанняў па змесце тэксту вучнямі: «Што вы ведаеце пра верас? Якому месяцу года ён даў назву?»

Да слоў, абазначаных малюнкамі, вучні вусна падбіраюць праверачныя словы і вызначаюць, якой літарай павінен быць абазначаны парны па звонкасці-глухасці зычны. Перад спісваннем неабходна, каб вучні далі тлумачэнне правапісу прапушчаных літар. Спісванне завяршаецца ўзаемаправеркай.

***Практыкаванне 19 (самастойная работа).***

Настаўнік дае інструкцыі ў адпаведнасці з заданнем практыкавання. Вучні запісваюць словы разам з праверачнымі словамі. Падкрэсліваюць у адпаведнасці з заданнем дапаможніка.

**4. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 17, практ. 20. Важна разам з вучнямі назваць па малюнках словы з зорачкамі. Вучні самастойна чытаюць верш і гавораць, якія словы трэба ўставіць замест адной, дзвюх і трох зорачак.

**5. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Якія словы з'яўляюцца праверачнымі для парных звонкіх і глухіх зычных? Калі іх не трэба правяраць? Калі трэба правяраць абавязкова?

*Працяг будзе.*

**Крыніца ілюстрацый:**
https://raskrasil.com/wp-content/uploads/Raskrasil.com-Snowflake-64.jpg

# На пытанні адказвае...

*Нацыянальны інстытут адукацыі*

**Вопрос по списыванию (контрольного в I–II классах и любого вида письма по образцу с доски или иного источника). Если учащийся при списывании готового текста допускает ошибку на неизученное правило, считать это за ошибку или нет?**

Ошибки на неизученные правила, которые допускаются при списывании с готового образца, свидетельствуют о том, что учащиеся не освоили алгоритм списывания, поэтому такие ошибки приравниваются к грубым.

Все орфографические, пунктуационные, грамматические и иные ошибки суммарно включаются в количественный показатель ошибок при оценивании обучающих классных и домашних работ, которые проводятся в письменной форме (см. примечание 5 к нормам оценки результатов учебной деятельности учащихся, которая осуществляется в письменной форме при выполнении классных и домашних работ, п. 14 главы 3 Методических указаний).

Списывание в I и II классах, наряду с другими видами работ, используется при проведении контрольных и тематических самостоятельных работ (см. примечание 1 к нормам оценки диктанта, словарного диктанта, грамотности при выполнении контрольной работы п. 14 главы 3 Методических указаний).